
Язэп Драздовіч

Мінск, "Інфармпрагрэс" 1993

©ДНВМП "Інфармпрагрэс"

ДРАЗДОВІЧ
ЯЗЭП НАРЦЫЗАВІЧ
1888-
-1954



ШЛЯХ ДА СВАЁЙ ЗОРКІ...

Язэп Драздовіч... Імя мастака, лёс і творчасць якога яскрава адлюстроўваюць высокі і горкі шлях чалавечага духу праз церніі да зорак... У жыцці Драздовіча зоркі мелі не просты, а сімвалічны сэнс. Складаецца ўражанне, што і пасля смерці зоркі не засталіся абыякавымі да яго памяці.

Язэп Драздовіч нарадзіўся 1 кастрычніка (па старому стылю) 1888г. на вялікае хрысціянскае свята Пакрава Прысвятой Багародзіцы. Астролагі б адзначылі, што ён нарадзіўся пад сузор`ем Шаляў, пад якім нараджаюцца людзі з надзвычай абвостраным эстэтычным светаўспрыманнем. Магчыма таму Я.Драздовіч быў не толькі мастаком Зямлі — ён быў захоплены гармоніяй Сусвету.

З гісторыі мастацтва відавочна заканамернасць, што тытанаў духу чалавецтва спараджае заўжды падчас культурнага адраджэння пэўнага этнасу. Шматграннасць асобы Я.Драздовіча моцнай плынню ўлілася ў хвалю беларускага Адраджэння. Сімвалам жыцця Язэпа Драздовіча сталі бясконцыя вандроўкі. Але дзіўна — ён нарадзіўся ў засценку Пунькі, што на Дзісеншчыне (зараз Глыбоцкі раён) і там жа пахаваны на Ліплянскіх могілках, непадалёку ад былога засценку. Усё вярнулася на кругі свае. Але застаўся след вялікага жыцця, чалавечыя межы якога незвычайна спалучыліся з бясконцасцю прасторы і часу.


За выключэннем сямі гадоў службы ў расійскім войску, жыццёвыя шляхі Я.Драздовіча не выходзілі за межы роднай зямлі і злучалі яе гістарычныя культурныя асяродкі — Вільню, Наваградак, Менск, Беласток, поўнач і поўдзень — Дзісеншчыну і Палессе. З дапамогай маці - ўдавы, што засталася адна, без зямлі, з шасцю дзецьмі, яе малодшы сын атрымаў прафесійную мастацкую адукацыю ў Віленскай рысавальнай школе прафесара жывапісу І.Трутнева. Але за ўсё жыццё ён не займеў уласнага дома. Нястача была такая, што іншы раз не хапала грошай на фарбы і палатно, а карціны даводзілася ствараць на каленях. Значная частка творчай спадчыны Я.Драздовіча, магчыма і большая,

згублена ці загінула бясследна, але і тое, што засталося, вымушае схіліць галаву перад памяццю вялікага падзвіжніка.

Творчасць Язэпа Драздовіча мае адметны характар: яна ўнікальная і традыцыйная, наіўная і мудрая, рэалістычная і сімвалічная. Ён працаваў у многіх відах выяўленчага мастацтва: кніжнай і станкавай графіцы, жывапісу, скульптуры. Яшчэ да 1-й сусветнай вайны з'явіліся яго працы ў галіне кніжнай графікі , сярод якіх вылучаецца афармленне ў стылі мадэрн першага выдання вершаў Канстанцыі Буйло «Курганная кветка». На пачатку грамадзянскай вайны Я.Драздовіч працаваў у Менску мастаком у беларускім літаратурным выдавецкім аддзеле камісарыята асветы, прымаў удзел у афармленні першага ў Савецкай Беларусі буквара-лемантара.

Напярэдадні 1921 г. мастак адправіўся да хворай маці на родную Дзісненшчыну. Мяжа, што прайшла па нашай зямлі ў выніку Рыжскай дамовы, раптоўная і на доўгія гады прымусіла яго застацца ў Заходняй Беларусі. Але і адтуль, нягледзячы на палітычны ўціск і матэрыяльныя цяжкасці, ён падтрымліваў сувязі з Інстытутам беларускай культуры, рэгулярна дасылаў у Менск свае замалёўкі помнікаў нацыянальнага дойлідства, этнаграфічных рэчаў, фіксаваў іх назвы і памеры. Мастацкія і навуковыя працы Я.Драздовіча неаднаразова адзначала прэміямі Акадэмія навук БССР.

У канцы 1920-х гадоў, падчас вандровак па Заходняй Беларусі, мастак стварае ўнікальныя графічныя альбомы — сотні малюнкаў, прысвечаныя помнікам старажытнага дойлідства Наваградка, Вільні, Крэва, Глыбокага і іншых месцаў. Яго замалёўкі гарадзішчаў і курганаў, замкаў і храмаў, гумнаў і хат і на сёння з'яўляюцца гістарычнай крыніцай для даследчыкаў і этнографаў. Але помнікі дойлідства для Я. Драздовіча не толькі рэаліі побыту, для яго яны — захавальнікі часу, канцэтрацыя духоўнасці народа, накіраваная з мінулага ў будучыню. Гэта асабліва відавочна пры параўнанні гістарычных твораў і касмічных



Віньетка для нот песні "My wyjdzim..." 1924, туш, пяро. 16,5х18,3 ДММ РБ



НАД ДЗІСЕНКАЙ.
туш, пяро. 1923

фантазій мастака, галоўная тэма якіх — светазарны горад усеагульнага шчасця.

Пералічваць творы Я.Драздовіча не мае сэнсу — гэта проста немагчыма з прычыны іх вялікай колькасці ці таго, што многія з іх не захаваліся альбо яшчэ не выяўлены даследчыкамі. Лягчэй пералічыць тэмы, з якімі ён першым увайшоў у беларускае мастацтва, серыі і цыклы, што аб'ядноўваюць шэраг яго работ, і нават незвычайныя жанры творчасці, дзе ярка выявілася індывідуальнасць, шчымлівая летуценнасць, як, напрыклад, у роспісе насценных дываноў.

У жывапісу і скульптуры Я. Драздовіч стаў пачынальнікам стварэння мастацкага вобраза нацыянальнага генія — Францішка Скарыны, якому мастак прысвяціў тэматычную серыю работ гісторыка-бытавога жанра. Яшчэ ў 1920-я гады Я.Драздовіч зацікавіўся старажытнай гісторыяй беларускіх земляў, што знайшло адлюстраванне ў яго літаратурнай творчасці. Адначасова ён распачаў гісторыка-славянскую тэму ў выяўленчым мастацтве. У карцінах з жыцця Полацкага княства мастак неаднаразова звяртаўся да вобраза славутага князя Усяслава Чарадзея.

Язэп Драздовіч адкрыў для беларускага мастацтва таксама касмічную тэму. У самых неспрыяльных умовах ён знаходзіў выйсце ў мастацкім і філасофскім асэнсаванні бясконцасці прасторы і часу, гармоніі «нябесных бегаў», аб чым сведчаць дзённікі мастака. З матчыных слоў ён успрымаў жыццё як хвілінку вечнасці. У снах яго былі дзіўныя па сваёй рэальнасці « паветракі-напалётныя вандроўкі па лунней краіне» і іншыя «астральныя падарожжы». Асабліва прыцягальнай для мастака-летуценніка была планета Сатурн, якой ён прысвяціў шэраг карцін з фантастычнымі сюжэтамі і пейзажамі. А яго «матывы архітэктуры на Месяцы « ўражваюць амаль прарочым прадбачаннем урбаністычных пошукаў сённяшняга дня і дня будучага.

Мастак падрабязна занатоўваў свае рэальныя і фантастычныя вандроўкі, але, на жаль, не ўсе

запісы захаваліся. Літаратурныя спробы Я.Драздовіча вызначаюцца шчырасцю і чысцінёй успрымання свету. У 1931 г. ім была выдадзена навукова-папулярная брашура «Нябесныя бягі». Акрамя гэтага нястомны асветнік запісваў фальклор, апрацоўваў для «Беларускага этнаграфічнага слоўніка» народную лексіку Дзісненшчыны і Піншчыны, рупна збіраў экспанаты для беларускага музея ў Вільні, настаўнічаў, маляваў дэкарацыі для аматарскіх спектакляў. Ужо ў сталыя гады мастак захапіўся стварэннем маляваных насценных дываноў, прызначаных для ўпрыгожвання сялянскіх хат. Паводле яго ўласных слоў, на гэтую малааплатную працу ён прысвяціў шмат часу дзеля развіцця эстэтычнага густу ў народзе той краіны, дзе нарадзіўся і вырас.

На дарозе, у маразы, знайшлі сяляне беспрытомнага «дзядзьку Язэпа» і адвезлі ў бальніцу, дзе ён,не ачуняўшы, памёр. Потым пахавалі на свае сродкі. І было гэта не пры панскай Польшчы, а ў Савецкай Беларусі, недзе на дзевяты год пасля Айчыннай вайны. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя год смерці Я.Драздовіча падае пад знакам пытання — «1954?» . Дзе ўжо казаць пра месяц і дзень...

Трагічны, самаахвярны лёс вечнага вандроўніка — ***зорны лёс.***

Габрусь Тамара Віктараўна
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН РБ

Першы беларускі каляндар
1909
фотаздымак М.Купавы



***

Прыйдзі, Новы Годзе, і не крыўдзі мяне нэндзаю-бядою, так як папярэднія — старыя...

Прынясі мне добрыя памысныя варункі жыцця дзеля працы маёй на карысць людзям праз навуку, праз прыгожае слова і прыгожыя творы мастацтва!

1 студзеня 1933 г.

***

Нішто не жывець, не расцець у агні. Нішто не жывець, не расцець у марозе. Толькі між агнём і марозам усё жывець, усё расцець, усё цвіцець, развіваецца, красуецца.

13 красавіка 1933 г.

***

Не хваліся ані тым, што ты багат, ані тым, што ты бедзен... Не цвярдзі таго, за што ты не можаш прысягнуць ва імя чыстаты сваёй совесці.

Не прыкланяйся і не пагарджай.

21 красавіка 1933 г.



СВЯТАР - МУДРЭЦ. Іл.да рамана «Гарадольская пушча». 1925, туш, пяро. 18,9 Х 14 см ДММ РБ



ГУМНЫ (СташкІ) ў ШаламІчах
(альбом «ПІншчына», 1926)
туш, пяро, 18 Х 26,5 см. ДМ РБ

Часопіс "Самапомач"
Вільня, 1934, прыватны збор



***

Хадзілі да братоў нябожчыка ксяндза-беларуса Рамейкі на новае радзіо паслухаць з Масквы «аб калхозах», з Менску—"Лявоніху»", з Варшавы — «Батлейку», з Будапешту — оперу, з Прагі чэшскай — усялякага роду музыкі.

20 снежня 1933 г.


***

Як гэта добра ідзець на здароўе ўмеркаваная фізічная праца. Ох, як смачна есцца і як прыемна аддыхаецца пасля яе.

Шмат калі хаджываў тут каля гэтага лесу і ніколі не звяртаў з такім эстэтычным пачуццём сваёй увагі на ягоную красу так, як у часы працы, прысеўшы на адпачынак закурыць.

Колькі велічы у гэтых цёмных сценах яловага лесу, а колькі лагоднасці ў гэтых далікатных постацях белых кудраватых бярозак на цёмным фоне гэтага лесу. Колькі прыгожа згарманізаваных форм у гэтых купках касматых бяроз і чорнае вольхі, асабліва пры лучах вячэрняга сонца.

14 верасня 1933 г.



ЗАСЦЕНАК ПУНЬКІ.
Месца нараджэння мастака.
1924, туш, пяро

***


Учора і сёння меў прыемнасць аглядаць велічава прыгожыя муры, як старадаўнейшы памятнік нашай краевай беларускай архітэктуры...



ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІ МУР ЗАМКА
(альбом «ЛІда» 1929)
туш , пяро 16х24 см ДЭМ Літвы



ЗАХОДНІ МУР ЗАМКА.
(альбом «ЛІда» 1929)
туш , пяро 16,7х22,1 см ДЭМ Літвы



Выгляд ЗАМЧЫШЧА З ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНЯГА БОКУ (альбом "Ліда", 1929) туш, пяро. 16,6х24,4 см. ДЭМ Літвы




ВІД З БРАМЫ на замкавы дзядзінец і шчыт замкавай капліцы ў Гальшанах, 1929, туш, пяро. 16,5x22,7 см ДММ РБ

***

Я люблю адведваць... невялічкія, у вясковай глушы касцелкі і царкоўкі, так усё там просценька і шчыра...

20 кастрычніка 1934 г.



КУШЛЯНЫ. Нутро старой капліцы, 1929, туш, пяро 23x19 см ДММ РБ

***


Гарадзішчы Гарадзец, Гарадольня, Гарадзея, Гараватка, Гародня і Язна заальбомаваны. Аўта — таксама.

Ліпень, 1934 г.


***

Гарадзішча «Гарадзец». Гэта адно з ужо вядомых нам (па Стрыйкоўскаму) у гісторыі нашага краю гарадзішч, ля якога нямала паложана славянскіх (крывіцкіх) і літоўскіх касцей... Гарадзец быў спалены і знішчаны на заўсёдныя часы, ад якога да нашага часу пазасталіся невялічкія рэшткі прызнакаў, што тут некалісь было тое, што ў тагдышнія часы магло называцца або замкам, або горадам.

Ліпень, 1934 г.



ГАЛЬШАНСКАЕ ГАРАДЗІШЧА. Выгляд з узвышша па Барунскаму тракту. 1929, туш, пяро




ВЫГЛЯД АД БАЗЫЛЛЯНАЎ НА БАСОКІ.
(альбом «Вільня»,1924)
туш , пяро. 16,5х23,5см ДММ РБ


***

Вось я і у Вільні... Усё па-старому, усё у тым самым парадку.

1 ліпеня 1933 г.

ГАРА ГЭДЭМІНА. (альбом «Вільня» 1930)
туш, пяро. 23 Х 31,2 см. ДММ РБ





ШТУЧНАЕ МОРА
(«Жыццё на Марсе»,1932)
акв., туш , пяро
18,4х25,5 ДММ РБ

***

Я веру, што тэхніка зямлян па заваяванні прастору не закончыцца на тым, што мы ўжо маем, а пойдзець далей аж да міжпланетарных падарожжаў...

Лістапад, 1934 г.



ПРЫРОДА МЕСЯЦА. АБЯЗВОДНЕНЫ ЦЫРК (альбом «КАСМАВІЗІІ»)
1947 акв., пяро 20,4х29 БАН РБ

***

... усё тое, што мне давялося бачыць на Месяцы праз любоў і веру ў звышнатуральнае, па-за часам і прасторам — не ёсць ані з мінуўшчыны, ані з будучыні, а настаяшчае, сучаснае, як яно ёсць цяпер.


І калі б знайшлася магчымасць для нашых зямлян зрабіць сапраўднае падарожжа на Месяц, знашлі б там шмат чаго, што я бачыў, і такім, як я бачыў.

9-10 верасня 1933 г.

***

Тускласветная папяляная ноч. Лячу і аглядаю з вышыні птушынага палёту.


20 лістапада 1934 г.



ГНЯЗДО. МЕСЯЧНЫ ГОРАД НЕПАДАЛЁКУ АД ЦЫРКА КАПЕРНІК.
(«Жыццё на Месяцы») 1932 акв., аловак., 17,9х25 ДММ РБ



НЯБЕСНЫЯ БЕГІ.
Вільня, 1931
Прыватны збор




НІРВАНА.
1925, вугаль
30,8X21,6 см ДММ РБ

***

У тую хату, дзе быў застанавіўшыся, назбіралася шмат цікавых мяйсцовых сялян, старыкоў, мужчын і падросткаў, якія закідалі цэлым радам навуковых пытанняў, а пераважна з касмазорыі...

Ліпень, 1934 г.




ВЕРАНДА РАТУНКУ
цырк Платону
(«Жыццё на Месяцы», 1932)
туш, аловак, пяро
15,5 X 23,2 ДММ РБ


***

І прыйдуць часы, калі бальшына жыхароў нашай планеты адмовіцца ад учасця ў войнах, адмовіцца ад гэтага штучна ўзаконенага сярод вякоў сільнейшымі гэтага свету праз уладу сваю над людзьмі, вялікага зладзейства, піхаючага цэлыя мільёны людзей на забойства. І ўсю тэхніку з навукамі абернуць не на паслугі гэтаму зладзейству, а на добрае дзела.


23 кастрычніка 1933 г.




ГАРА СІГНАЛ у цырку Платона
(«Жыццё на Месяцы», 1933)
туш, пяро



ТРЫВЕЖ. Панарама месяцовага горада.
1932-33. п.,алей 61 X 101 см МСБК АН РБ




НЯБЕСНЫЯ БЕГІ.
Вільня.1931.
Прыватны збор.



СУСТРЭЧА ВЯСНЫ НА САТУРНЕ.

1932 г. п.,алей 59,5 х 99 см МСБК АН РБ





ДЫВАН «КРАЯВІД З ЗАМКАМ»
1930-40 п., тэмп. 142х191 ДММ РБ

***

Усё добра і весела... Няма нічога прыямнейшага як даваць жыццё раслінам — пахаць ды сеяць...

16 мая 1933 г.

***

Ад месяца ліпеня аж да канца месяца верасня аддаюся дзеля развіцця ў народзе мастацкага эстэтычнага пачуцця і размалёўваю для запрашаючых на простым вясковым саматканым афарбаваным на чорнам палатне рознаўзорыстыя дываны-арэналы, з месячнымі пейзажамі на асяродках.

Ліпень,1934 г.

***

Ой, як трудна грош даецца!

Усяго разам за вясну, лета і восень зрабіў 25 штук дываноў, а зарабіў, не лічачы расходы на фарбы, алей і інш.— 81 залатоўку.


Кастрычнік, 1934 г.

***

Сягодня дзень Пакрова, па ст.ст., 1 акцябра . Дзень майго ураджэння... Рад быў бы памянуць гэты дзень, ды не маю з чым. І ці прыйдзецца мне калі хоць бы раз да адзначыць папюдску — як дзень нараджэння, як дзень асабістага свята майго?..

Беднасць ... Дастаткі не пазваляюць ...

14 кастрычніка 1933 г.



ДЫВАН. МЕСЯЧНЫ КРАЯВІД З ЗАМКАМ.
1939. п., тэмп., 132x208 см ДММ РБ





КУФЭРАК з аўтапартрэтнай выявай ,
дрэва, рэзь, палІхром. 18х29,5х20,5 МСБК АН РБ

ПАРТРЭТ НЕВЯДОМАГА.
дрэва, рэзь, палІхром. 41,5х19х2
МСБК АН РБ

***

Не маю ані палатна, ані фарб, ані адпаведнага мейсца для працы — каб малявацъ. Дык мушу хоць гэтакаю дробязгліваю разьбою заняцца.

20 верасня 1933 г.

***

Адбывалася спатканне тутэйшым народам вялікага свята вясны, свята сымбалю вялікай пабеды аднаго чалавека над многімі, якія яго аклявталі, прадалі, пагарадзілі, абясчэсцілі, прынізілі, знікчэмнілі, абяспраўілі ў правах чалавечых і са здзекамі ўмярцвілі, а ён — ён уваскрос! Як тая, зьнішчаная смяротнымі марозамі нашай паўночнай зімы, вясною прырода. І як тут не цешыцца і не пяяць «Алілуя». І я ад самага найшчырэйшага сэрца пяяў.

Вялікдзень, 1935 г.



ЖАНОЧЫ ПАРТРЭТ
дрэва, рэзь, паліхром
32х20х9,5 см
МСБК АН РБ



МЕНСК. ВЫГЛЯД
З ШПІТАЛЬНА-ТРАЕЦКАГА ЗАВУЛКА.
1919. туш, пяро



Ігар Голубеў.
ВЕЧНЫ ВАНДРОЎНІК.

***

Шлях вандраванняў Язэпа Драздовіча праходзіў і праз Менск. На Траецкай гары знаходзілася вышэйшая жаночая школа, у якой ён выкладаў маляванне. Паблізу тых мясцін, дзе мастак любіў блукаць, аглядаючы краявіды старога Менска, на Траецкім прадмесці яму пастаўлены помнік работы скульптура Ігара Голубева. Аўтару скульптуры ўдалося перадаць уласцівыя для творчасці Я.Драздовіча суадносіны рэальнага свету і свету фантазіі, моц яго перакананасці і любові да роднага краю. Постаць мастака-вандроўніка ў сціплай сялянскай вопратцы ўкрывае дрэва-мроя, у кроне якога груваздзяцца сілуэты знаёмых вежаў беларускіх замкаў і храмаў і фантастычныя касмічныя прывіды мастака. Назва скульптурнай кампазіцыі сімвалічная — «Вечны вандроўнік».

Габрусь Т.В.





Фундатарам стварэння помніка Я.Драздовічу з'яўляецца Мінскі гарадскі Фонд культуры. Адліўка ў бронзе выканана кааператывам "Адраджэнне рамёстваў"

Ігар Голубеў.
ВЕЧНЫ ВАНДРОЎНІК.

Выказваем шчырую падзяку
выдавецтву «Беларусь» за прадстаўленне
фотаздымкаў.

Язэп Драздовіч

аўтар тэксту **Т.В. Габрусь**
рэдактар **Ю.І. Дзянісаў**
макет і афармленне мастака
А.А.Жданоўскай

Фармат 60 х 84/16. Папера афсетная.
Гарнітура журнальная . Афсетны друк. Тыраж 5000.
Заказ 4944. ЛВ №294 ад 19 студзеня 1993 г.

Мінская фабрыка каляровага друку

Мінск, пр. Машэрава.7Д.ВПМП "Інфармпрагрэс"


3300